Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

16-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

СЕРАДА
4 СТУДЗЕНЯ 1933 г.
№ 4 (3660)

ТЭЛЕФОНЫ:
Аднак. рэдактар 7-60
Адк. сакратар 6-74
Сакратар . . . 6-45
Начная рэдакцыя 12-65
(пад'ем)
Выдавецтва . . . 2-44

АЎТАМАТЫ:
Адк. рэдактар . 20-831
Адк. сакратар . 22-161
Сакратар . . . 22-160
Бухгалтэрыя . . 22-158

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 1 руб.
3 „ . . . 3 „
6 „ . . . 6 „
Падпіска прымаецца выключна на пошце і лічбавосдамі.
Рукапісы не зьвяртаюцца

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.
КОШТ АБЯВЫ: 1 радок нонпарэль 1 руб. 50 к.
КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ аб згубе 1 дакумэнту 2 руб.

Сеньня у нумары

Пра забясьпечаньне поўнага выкананьня пляну загатовак масла, малака і сыру. Пастанова СНК і ЦК КП(б)Б (1 стар.).
ЗБОЖЖАЗАГАТОЎКІ. На ўсіх вучастках дамагчыся неадкладнага выкананьня пляну кожнай вёскай, калгасам, паселішчам, аднаасобнай гаспадаркай. (1 стар.).
ЛЕНАЗАГАТОЎКІ. Ударыць па ўсякіх спробах затармазіць паток лёнавалакна. (1 стар.).
МЯСАЗАГАТОЎКІ. У бязьлітаснай барацьбе з кулаком і яго агентурай дабіцца датэрміновага выкананьня мясазагатовак 1-га кварталу 1933 году. (2-я стар.)
НА САЮЗЕ ССР (2-я стар.).
З фронту індустрыялізацыі. (2-я стар.).
ЗА ІРАНЦАЙ (2-я стар.).

Завяршыць збожжазагатоўкі па ўсіх вучастках

Дамагчыся неадкладнага выкананьня пляну кожнай вёскай, калгасам, паселішчам, аднаасобнай гаспадаркай

Пра забясьпечаньне поўнага выкананьня пляну загатовак, масла, малака і сыру

Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б

Для забясьпечаньня поўнага выкананьня пляну загатовак месла, малака, і сыру, прадугледжанага пастановай СНК БССР і ЦК КП(б)Б «Пра загатоўкі, масла, малака і сыру» (апублік. у газ. «Савецкая Беларусь» ў № 283 за 25 сьнежня 1932 г.), Савет Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б ПА СТАНАЎЛЯЮЦЬ:

1. Прапанаваць Народнаму камісару снабжэньня — тав. БАЛЦІНУ, Народнаму камісару земляробства—тав. РАЧЫНСКАМУ, упаўнаважанаму Народнага камісарыяту саўгасаў—тав. Масюкову, Белкапсаюзу—тав. ЦАРОНКУ ўзяць пад непасрэдны, штодзенны кантроль работу па загатоўках масла, малака і сыру па сваіх сыстэмах.

2. Прапанаваць райкомам КП(б)Б і раённым Выканаўчым камітэтам мабілізаваць увагу раённых партыйных і савецкіх арганізацый і ўсю грамадзкасьць на выкананьне пляну маслазагатовак і ўстанавіць штодзенны кантроль за работай загатоўшчыкаў і сельскіх саветаў, а таксама за здачай малака па асобных сэктарох (саўгасы, калгасы, МТФ, калгасьнікі, аднаасобнікі, кулацка-заможныя гаспадаркі).

Прапанаваць аддзелу кадраў ЦК КП(б)Б і райкомам КП(б)Б узмацніць раённы апарат Маслапрому і дырэктарскі склад маслазаводаў лепшымі праверанымі работнікамі.

4. Забараніць мабілізацыю работнікаў масларобчай прамысловасьці на іншыя гаспадарча-палітычныя кампаніі да выкананьня гадавога пляну масла—сырзагатовак.

5. Забараніць назначэньні, зьняцьце і пераход на іншыя работы кіраўнікоў раённых арганізацый масларобча-сыраваранай прамысловасьці без узгадненьня з рэспубліканскімі цэнтрамі гэтых арганізацый (Белмаслапром, Белкапмалако).

6. Забараніць скарыстаньне спэцыялістаў масларобча-сыраваранай прамысловасьці не па спэцыяльнасьці.

Даручыць Народнаму камісарыяту працы тэрміновa зьвярнуць у сыстэмы Белмаслапрому і Белкапмалако ўсіх спэцыялістаў, якія працавалі ў гэтых сыстэмах на працягу апошняга году.

7. Прапанаваць Народнаму камісарыяту снабжэньня, Народнаму камісарыяту земляробства, Белкаапсаюзу, упаўнаважанаму Народнага камісарыяту саўгасаў вылучыць з сваіх апаратаў заказных працаўнікоў і паслаць іх у раёны і сельсаветы для дапамогі раённым з такім разьлікам, каб на працягу дэкады ўручыць абавязацельствы ўсім малако-здатчыкам і дабіцца рашучых зрухаў у загатоўках малака, якія забясьпечваюць датэрміновае выкананьне пляну маслазагатовак.

8. Прапанаваць Цэнтральнаму і мясцоваму друку сыстэматычна асьвятляць пытаньні пра ход маслазагатовак.

Старшыня Савету Народных камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар ЦК КП(б)Б М. ГІКАЛО.
2 студзеня 1933 г.
г. Менск.

Абна іць склад Сушчэўскага сельсавету

(Ад нашага спэцкора)

ЧАВУСЫ. Сушчэўскі сельсавет мае толькі 69,9 проц. выкананьня пляну збожжазагатовак разам з насенпазыкай. Прычыны нездавальняючых тэмпаў загатовак і звароту дзяржаве насенпазыкі крыюцца ў тым, што на радзе вёсак члены сельсавету зжыліся з кулаком і заможнікамі і разам з імі сабатуюць загатоўкі збожжа.

Па в. ЧАРНЯЎЦЫ член сельсавету НАВАСЕЛЬЦАЎ адкрыта сабатаваў здачу (продаж) дзяржаве лішкаў збожжа. НАВАСЕЛЬЦАЎ сам ня здаў дзяржаве ніводнага кілёграма збожжа, прыкрываў кулакоў і заможнікаў. На працягу ўсёй сваёй работы член сельсавету НАВАСЕЛЬЦАЎ ня прымусіў ніводнага кулака і заможніка здаць цьвёрдыя заданьні. За патураньне кулаку, за зрыў збожжазагатовак, выязная сэсія Чавускага р-йсуда сурова пакарала НАВАСЕЛЬЦАВА.

Адначасова выязная сэсія разглядзела справу зрыўшчыкаў загатовак ТАЦЯНКОВА ХАРЫТОНА,—заможніка, а таксама ЦЫГАНКОВА П., БУЛЬБАКОВА ЗАХАРА, ЗАХАРАВА ІЛЬЛІ і ЛОСЕВА ЦЕРАХА. Апошнія асуджаны за злосны сабатаж загатовак на 3 гады пазбаўленьня волі кожны з канфіскацыяй сельска-гаспадарчых прадуктаў. ТАЦЯНКОЎ асуджаны на 7 год з высылкай у аддаленыя мясцовасьці Саюзу.

Масы калгасьнікаў, беднякі і сераднякі - аднаасобнікі СУШЧЭЎСКАГА сельсавету горача віталі рашэньне суда. На агульных сходах у адказ на хітрыкі клясавага ворага створаны ўдарныя брыгады з лепшых збожжа здатчыкаў па завяршэньні збожжазагатоўчай кампаніі.

Яшчэ не апраўдалі сябе на фронце барацьбы за збожжа і за іншыя віды загатовак члены сельсавету ПРУДНІКАЎ і АЎГЕЕНКА ЦІМОХ. Яны ня выканалі свайго пляну, ня прымаюць рашучых мер да зрыўшчыкаў загатовак. У адносінах да гэтых членаў сельсавету трэба таксама прыняць рашучыя суровыя меры.

СУШЧЭЎСКІ сельсавет павінен даць бязьлітасны адпор кулацкаму сабатажу загатовак і ў бліжэйшыя дні выканаць пляны ўсіх відаў загатовак.

Б—ў.

ЧОРНАЯ ДОШКА

зрыўшчыцкау загатовак

За злоснае і сыстэматычнае невыкананьне плянаў дзяржаўных загатовак сельгаспрадуктаў, за сабатаж арганізаваны кулацкімі элемэнтамі, пастановай СНК БССР і ЦК КП(б)Б занесены на чорную дошку наступныя раёны і сельсаветы:

РАЁНЫ:

1. Талачынскі, 2. Горацкі, 3. Кармянскі, 4. Дуброўенскі, 5. Асьвейскі.

Сельсаветы:

па Чэчэрскім раёне — Глыбачанскі,
па Будзі-Кашалёўскім—Нядальскі, Патапаўскі і Губіцкі,
па Менскім р-ёне—Абчацкі, Папярнянскі,
па Віцебскім—Старасельскі і Рудакоўскі,
па Сеньненскім—Мішчонскі і Алексінскі,
па Дзяржынскім—в. в. Станкава, Каменка і Шаланошчына,
па Пятрыкоўскім раёне—Пціцкі, Чалюшэвіцкі і Асавецкі сельсаветы,
па Клімавіцкім р-ёне—Касавіцкі сельсавет,
па Лепельскім раёне—Ляхаўскі сельсавет і вёскі Баоча, Круглицы і Сталбцы,
па Чэрыкаўскім раёне—Каменскі сельсавет,
па Бегомльскім раёне—Дамаржыцкі сельсавет,
па Чавускім раёне—Піздкоўскі, Рабаўскі і Дзедзіноўскі,
па Лагойскім раёне—Гайнінскі,
па Нараўлянскім р-не—Мухаедаўскі, Хатковіцкі,
па Чашніцкім раёне—Ульлянавіцкі, Альчанскі,
па Магілеўскім раёне—Вышаўскі, Хонаўскі, Рафалаўскі, Гусьлішчанскі,
па Сіроцінскім раёне: — Заранаўскі і Мішкаўскі сельсаветы
па Клічаўскім р-не: — Вільковіцкі, Грабавецкі, Даўжанскі і Дубенскі
па Суражскім р-не:—Камароўскі і Войтаўскі
па Аршанскаму р-не—Буеўскі
па Пухавіцкаму р-не:—Гарэліцкі, Слабодзкі, Задашчанскі і Шацкі
па Вушацкім раёне—Чарапаўшчынскі і Вусальскі сельсаветы
па Крычаўскім—Цяшанскі сельсавет
па Дрысенскім—Юзэфпольскі і Каркалеўскі с. с.

У гэтых раёнах і сельсаветах неадкладна спыняецца падвоз тавараў і каапэрацыйны і дзяржаўны гандаль на месцы.

Вывозяцца з каапэрацыйных крам і складаў усе наяўныя прамтавары.

Поўнасьцю забараняецца калгасны гандаль.

Спыняецца ўсякага роду крэдытаваньне і датэрмінова спаганяюцца ўсе выданыя крэдыты і інш. фінансавыя абавязацельствы.

Пухавіцкі раён плян выканаў

ПУХАВІЧЫ, 3-I 1933 г. (па тэлефону). Пухавіцкі раён выканаў плян збожжазагатовак на 100,4 проц. Плян мясазагатовак чацьвертага кварталу 1932 г. выкананы на 114,5 проц. Фінплян—на 103,5 проц.

ШАСТАКОЎ.

Перамога міхееўцаў

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

1-га студзеня—першы дзень другой пяцігодкі—для калгасьнікаў, бяднякоў-серадняцкага сялянства і сельскіх арганізацый Міхееўскага сельсавету (Крычаўшчына) было вялікі сьвятам. Сельсавет у вызначаны ЦК партыі і ўрадам тэрмін перавыканаў пляны загатовак па збожжы, малаку, мясе і бульбе. У гэты дзень перадавікоў загатоўчага фронту наведаў старшыня ЦВК СССР і БССР тав. ЧАРВЯКОЎ.

Вялікае школьнае памяшканьне Міхееўскай школы не ўмясьціла ўсіх жадаючых трапіць на сход, прысьвечаны прыезду тав. ЧАРВЯКОВА, частка разьмясьцілася ў сенцах, а частка засталася на вуліцы каля школы. Парадак дня складаецца тут-жа на сходзе. Калгасьнікі і працоўныя аднаасобнікі даручаюць сельсавету старшыням калгасаў расказаць прадстаўніку ЦК партыі і ўраду аб выніках іх барацьбы за рэалізацыю сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б.

Перамога міхееўцам дасталася не лёгка. Кулацка-заможныя элемэнты аказвалі шалёнае супраціўленьне, вялі актыўную работу па зрыве загатовак, яны вялі за сабой найбольшую сталую частку беднякоў і сераднякоў. Цьвердазадальнікі ўсялякімі хітрыкамі імкнуліся ўхіліцца ад здачы зоожжа і іншых сельска-гаспадарчых культур, хавалі збожжа, прыкідваліся «соединчыкамі», якім на толькі нельга выканаць цьвёрдае заданьне, але нібы і есьці няма чаго. Асобныя члены сельсавету патуралі кулаку, зрасьліся з кулацка-заможнымі элемэнтам, сабатавалі загатоўкі.

Калгасны і бяднацка-серадняцкі актыў мабілізаваўся на дапамогу сельскаму савету і мясцовым партячэйкам. Вялікую дапамогу аказалі сельсавету і рабочыя брыгадзіры, што прыехалі з Віцебскага чыгуначнага вузла для загатовак бульбы. Кулацкія элементы былі выкінуты са складу сельсавету і аддаены пад суд.

У выніку рашучай барацьбы з кулацка-заможнымі элемэнтамі і іх агентурай—апартуністамі, плян збожжазагатовак калгасамі сельсавету выкананы на 108,8 проц., аднаасобнікамі—на 103,5 проц., з кулацка-заможных гаспадарак спагнана 121,5 проц. цьвёрдых заданьняў,—рапартуе старшыня сельсавету.

— Па мясе сельсавет выканаў плян на 114 проц., калгасы і працоўныя аднаасобнікі свае пляны перавыканалі, а з цьвёрда-заданьнікаў спагнана 150 проц.

— Плян па бульбе выкананы на 106 проц., цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных элемэнтаў спагнаны на 157 проц., калгасы здалі на 101 проц. і аднаасобнікі—на 104,4 проц.

— Па лёнавалакне наш сельсавет плян выканаў на 80 проц. Тут мы яшчэ адсталі са спагнаньнем цьвёрдых заданьняў, але прымусім кулакоў і заможнікаў здаць поўнасьцю.— працягвае свой рапарт старшыня сельсавету.

У Міхееўскім сельсавеце няма ніводнага калгасу, ніводнай вёскі, дзе-б ня былі поўнасьцю выкананы пляны па збожжазагатоўках, ня былі-б поўнасьцю спагнаны цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных элемэнтаў.

— Мы з цьвёрдазаданьнікамі на цацкаліся, супроць іх ужываем усе меры адміністрацыйнага ўзьдзейнічаньня. Мы сілі моцна па кулаку і злосному сабатажніку...

Сьледам за старшынёй сельсавету аб выкананьні сваіх абавязкаў перад дзяржавай рапартавалі калгасы—«Чырвоны партызан», «Пралетарская перамога» і «Колас».

— Наш калгас,—кажа старшыня праўленьня калгасу «Чырвоны партызан»—па ўсіх відах загатовак плян выканаў звыш чымся на 100 проц. У гонар прыезду тав. ЧАРВЯКОВА нашы калгасьнікі з сваіх уласных рэсурсаў здаюць дзяржаве 2 цнт. сала.

У калгас «Пралетарская перамога» прабраліся кулакі і заможнікі, якія сваёй дзейнасьцю развальвалі калгас, яны атрымалі рашучы адпор з боку калгасьнікаў беднякоў і сераднякоў і былі выгнаны. Зараз калгас ня толькі выканаў плян загатовак па ўсіх культурах, але калгасьнікі чырвоным обозам звыш пляну здалі 41 цнт збожжа і 3 цнт. добранякасьнага валакна.

Аб перамогах рапартаваў і калгас «Колас». Ён таксама выканаў свае пляны па загатоўках і зараз буйна памяшканьне для дзіцячых яслёў і сьвітлярнікаў.

Член сельсавету тав. Сасонкін указвае, што барацьба за збожжа і валакно была ня лёгкай. Некаторыя члены сельсавету дапамагалі кулаку, сабатавалі загатоўкі. Гэтыя «члены» сельсавету—кулацкія агенты і сабатажнікі—выведзены са складу сельсавету і аддаены пад суд.

Калгасьнікі-актывісты — Манеўскі, Гарохаў і інш. запэўнівалі ў адзыве тав. ЧАРВЯКОВА ЦК партыі і савецкі ўрад, што калгасы Міхееўскага сельсавету і надалей будуць моцнай і вернай апорай савецкай улады ў вёсцы і па-баявому правядуць першую вясну другой пяцігодкі.

З вялікай увагай слухае сход прамову старшыні ЦВК т. ЧАРВЯКОВА, які вітае калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў Міхееўскага сельсавету з ажыцьцяўленьнем у тэрмін дырэктывы партыі і ўраду аб загатоўках і тут-жа заклікаў таксама пабаявому, у самы кароткі тэрмін, скончыць загатоўкі па ўсіх іншых культурах па кожнай вёсцы, па кожнай гаспадарцы.

— Нам трэба хутчэй скончыць загатоўкі і зараз-жа распачаць работу па падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі, змагацца за павышэньне ўраджайнасьці.

— Кулак разгромлены, але ён яшчэ не забіты. Кулацка-заможныя элементы іх агенты—апартуністы будуць імкнуцца сарваць нам пляны пасеўнай кампаніі так, як яны спрабавалі ў вас сарваць загатоўкі.

— Яшчэ больш клясавай пільнасьці, яшчэ шчыльней калгасьнікі, беднякі і сераднякі - аднаасобнікі гуртуйцеся вакол партыйных ячэек і сельсаветаў, бязьлітасна змагайцеся з клясавым ворагам і перамога будзе за намі.

Доўгія дружныя воплескі былі лепшым довадам, што калгасьнікі, беднякі і сераднякі і надалей будуць рашуча змагацца за генэральную лінію партыі.

Сход заварчаецца з адозвай да ўсіх сельсаветаў Крычаўшчыны ня пружыць усе сілы для хутчэйшага скончэньня загатовак і выклікаў іх на сацспаборніцтва на лепшае правядзеньне веснавой пасеўнай кампаніі.

Закрываецца сход, ледзь прабраўшыся на вуліцу. Да т. ЧАРВЯКОВА падыходзіць барадаты дзядзька.

— Таварыш старшыня, дзякуй вашай партыі і ўрадзе, за тое, што яна корстка змагаецца з кулаком і заможнікам. Гэта правільна і добра робіцца, трэба іх хутчэй зусім даканаць,—гаворыць гэты селянін.

— Я,—дадае ён,—усё пляны загатовак выканаў і сёньня ўступаю ў калгас, бо толькі ў калгасе можна ўзьняць дабрабыт.

В. З-ў.

Не лібэральнічаць са зрыўшчыкамі загатовак

ВІЦЕБСК. Раён мае шматтысячную партыйную арганізацыю, буйны прамысловы цэнтр, наяўнасьць добрых дарог. Плян збожжазагатовак сучорашняга мінулага году для раёну зьменшаны на 500 тон.

Наяўнасьць усяго гэтага давала магчымасьць раёну выканаць збожжазагатоўкі датэрмінова, паказаць прыклад бальшавіцкай барацьбы за збожжа іншым раёнам. Але гэтага не здарылася—раён апынуўся ў радох адстаючых па збожжазагатоўках. На становішчы на 31 сьнежня ён займае 36 месца па БССР.

Чаму так здарылася, дзе асноўныя прычыны адставаньня?

Прычыны хаваюцца ў тым, што ў Віцебску пытаньнем збожжазагатовак да 20 сьнежня як належыць не займаліся, кулацка-заможная частка вёскі, якая сабатавала загатоўкі, не атрымала рашучага адпору, камуністы з партбілетам у кішэні, стаўшы на шлях абароны кулака і сабатажу загатовак (Казлоўскі, Масьленікаў, Бундзікаў, Каваленка і інш.), раённымі арганізацыямі не заўважаліся, хоць «Віцебскі пралетары» на сваіх старонках аб гэтых «камуністах» неаднаразова пісаў і патрабаваў прыняцьця тэрміновых мер.

Толькі з прыездам у Віцебск сакратара ЦК КП(б)Б тав. ШАРАНГОВІЧА раённыя арганізацыі ўзяліся за справу загатовак.

«Камуністы»-сабатажнікі загатовак: старшыня Ялагінскага сельсавету—КАЗЛОЎСКІ, старшыня калгасу «1-га мая»—БУДЗІКАЎ, старшыня калгасу «Камінтэрн»—КАНАВАЛЕНКА, сакратар В. Летчанскай партячэйкі—МАСЬЛЕНІКАЎ і інш.—выключаны з радоў партыі і прыцягнуты да судовай адказнасьці.

РУДАКОЎСКІ, СТАРАСЕЛЬСКІ і МІКАЛОЎСКІ сельсаветы—цалкам, вёскі ЛЯСНАЯ СЛАБАДА—МАШКАНСКАГА сельсавету, Сакольнікі і Масьлены—Бараўлянскага сельсавету занесены на чорную дошку. З крам гэтых сельсаветаў і вёсак вывезены прамтавары, накіраваны парттрой ка для праверкі партячэек, апаратаў сельсаветаў і сельспажтаварыстваў і для ачысткі іх ад чужых элемэнтаў. За бязьдзейнасьць зьняты з работы старшыня В. Летчанскага сельсавету ІЛЬІН; прэзыдыум гэтага сельсавету распушчаны.

Прыняцьцё рашучых мер дало значны зрух у збожжазагатоўках. Калі ранней пяцідзёнка давала прырост у 2—2,5 проц., дык з 20 па 25 сьнежня прырост складае 14,8 проц. на 31 сьнежня плян збожжазагатовак па раёне выкананы на 96,7 проц. Асобныя сельсаветы (Віцебскі, Даўжанскі, Сяўлюцкі паказалі прыклады бальшавіцкай барацьбы за збожжа. Гэтыя сельсаветы (Віцебскі, Даўжанскі, Сяўлюцкі выканалі цалкам.

Крывую збожжазагатовак па раёне цягнуць уніз такія сельсаветы, як МІКАЛОЎСКІ (выканаў плян толькі на 67 проц. пляну), РУДАКОЎСКІ (75,3 проц.), БАБІНІЦКІ (76,5), МІКАЛЕЎСКІ, В. ЛЕТЧАНСКІ, РУДЗІНІЦКІ.

Характарна тое, што ад МІКАЛОЎСКАГА сельсавету на працягу сьнежня месяца не паступіла ніводнага кілёграма збожжа. Раённыя-ж арганізацыі гэтага не хацелі заўважыць, рашучых мер да спыненьня гэтага агіднага зьявішча ня прымалі, і толькі ў апошніх лічбах сьнежня прыняты меры ўзьдзейнічаньня.

Сабатаж кулацка-заможных гаспадарак яшчэ не зломлены ў Старасельскім сельсавеце цьвёрдыя заданьні спагнаны толькі на 65,5 проц.), ў ЛЕТЧАНСКІМ, ЗАМАСТОЦКІМ і МІКАЛОЎСКІМ сельсаветах, далі кулаку магчымасьць пахаваць збожжа. У выніку гэтага цьвёрдыя заданьні па раёне спагнаны толькі на 79,7 проц.

РУДНІЦКІ сельсавет—адзін з рашаючых сельсаветаў у выкананьні раённага пляну збожжазагатовак. Але ён увесь час цягнецца ў хвасьце. Плян збожжазагатовак ім выкананы толькі—на 81 проц. Збожжазагатоўкі па гэтым сельсавеце былі дэзарганізаваны. Атрымалася гэта таму, што былы член бюро ГК ГАЕЎСКІ і член прэзыдыуму Віцебскага гарсавету ЦУКЕРМАН пры давядзеньні пляну па гэтым сельсавеце паслухалі апартуністычнае разважаньне старшыні сельсавету МІХЕЕВА і сакратара партячэйкі Багданава аб нерэальнасьці пляну і самаўласна зьменшылі плян па аднаасобным сэктары на 130 цнт.

Зьменшаны плян збожжазагатовак яны параілі мясцовым работнікам выканаць на 90 проц., а потым «будзе відаць». Толькі 14 сьнежня «зьнятыя» 130 цнт. былі даведзены да сельсавету. ГАЕЎСКІ і ЦУКЕРМАН фактычна выканалі заказ кулака.

Аналёгічныя факты «работы» ГАЕЎСКАГА і ЦУКЕРМАНА ёсьць і па Шумнянскім сельсавеце.

Кулак Курыленка з вёскі Фёдароўка, арганізатар пабойкі сельвыканаўцы ПАСЬЦЕЕВА, гэтым-жа ЦУКЕРМАНАМ быў вызвалены бяз ведама сельсавету ад цьвёрдага заданьня.

Зрыўшчыкі загатовак—Гаеўскі і Цукерман, якія выконвалі заказ кулака, дагэтага часу не прыцягнуты да адказнасьці.

У рашучай барацьбе з кулаком і яго агентурай Віцебскі раён зможа пасьпяхова ў бліжэйшыя дні завяршыць збожжазагатоўкі.

Б. ВІЦЕБСКІ.

Лёнапрадукцыю—сацыялістычнай прамысловасьці

Ударыць па ўсіх спробах затармазіць паток лёнавалакна

Працаваць тэмпамі перадавых раёнаў — поўнасьцю завяршыць лёназагатоўкі

Жыткавіцкі раён выканаў плян лёназагатовак

ЖЫТКАВІЧЫ. На 1-га студзеня раён цалкам выканаў плян лёназагатовак—па лёнавалакне на 100,3 проц., па лёнасемі на 100,4 проц. Цьвёрдыя заданьні спагнаны па лёнавалакне на 98,4 проц., па лёнасемі—на 94,9 проц.

Гэтых посьпехаў раённыя партарганізацыі дамагліся ў выніку своечасовай мабілізацыі калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў на выкананьне за гатовак. Рашучы адпор атрымаў клясавы вораг і яго агентура, якія імкнуліся сарваць загатоўкі. Старшыня ЛЯХАВІЦКАГА сельсавету ГРЫБЕЙНІК і райупаўнаважаны РАМАШЭЎСКІ зрасьліся з заможнай часткай вёскі, п'янствавалі з кулакамі і ўсякімі сродкамі імкнуліся, каб зьменшыць цьвёрдазаданьнікам пляны загатовак. Па гэтым сельсавеце мелі месца такія выпадкі, калі кулацкія гаспадаркі атрымлівалі значна меншыя заданьні, чым беднякі. Напрыклад, кулак АГІЕВІЧ ЯЗЭП павінен быў здаць толькі 13 кілёграм лёнавалакна ў той час, калі бяднацкія гаспадаркі ў парадку самаабвясьпельства здавалі па 25 кілёграм валакна. Гэтая зграя кулацкай агентуры зьменшыла пляны па лёнавалакне на 1000 кг., па лёнасемі—на 900 кг.

Партарганізацыі раёну хутка выявілі твар клясавага ворага ў асобе Грыбейніка і Рамашэўскага. Кулацкія агенты выключаны з радоў партыі і прыцягнуты да судовай адказнасьці. У гэты сельсавет была тэрмінова накіравана брыгада актыву на чале з упаўнаважным райкому партыі тав. ЖДАНОВІЧАМ. У выніку работы брыгады, пырокага разгортваньня масавай работы і бязьлітаснага націску на кулака сельсавет выканаў плян па лёнавалакне на 105 проц.

Узорна змагаліся за лён РУДНЯНСКАЯ партячэйка і сельсавет. Усе партыйцы і камсамольцы былі прымацаваны да калгасаў і паселішчаў, партячэйка і сельсавет арганізавалі буксірную брыгаду жанчын-ударніц. На чале брыгады былі пастаўлены лепшыя калгасьніцы—ударніцы Майстровіч і Кацудзінская. У выніку работы гэтай брыгады аднаасобнікі в. Рудні першымі ў сельсавеце выканалі пляны лёназагатовак. Добра арганізавалі і правялі заготоўчую работу ЮРАВІЦКІ і ЖЫТКАВІЦКІ сельсаветы. Калгасьнікі калгасу «ПРАЛЕТАРЫ», Жыткавіцкага сельсавету, арганізавалі апрацоўку лёну ў 3 зьмены. Дзякуючы гэтаму ўжо на 20 сьнежня калгас значна перавыканаў пляны па лёназагатовках—замест 550 кг. было здадзена 700 кг. валакна. Ударнікі гэтага калгасу арганізавалі буксірную брыгаду жанчын, якая ўзяла на буксір калгас імя VI ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ, у выніку чаго на 1-га студзеня апошні цалкам выканаў плян лёназагатовак, здаўшы (прадаўшы) дзяржаве 600 клг. валакна.

(БЕЛТА).

Сушыльна-мяльныя пункты на нагружаны

Вушачы. Лёназагатоўкі па раёне праходзяць надзвычайна марудныя тэмпамі. 27 сьнежня плян выкананы толькі на 45 проц. Асабліва адстаюць Чарапоўшчанскі, Усайскі, Кубліцкі і Гарадзецкі сельсаветы, якія выканалі плян ад 15 да 17 проц. На гледзячы на тое, што ёсьць строгая дырэктыва аб тым, каб сушыльна-мяльныя пункты мелі поўную нагрузку, па гэтых сельсаветах пункты зусім не працуюць. Цьвёрдыя заданьні з кулацкіх гаспадарак не спагнаны. Партячэйкі і кіраўніцтва гэтых сельсаветаў працягваюць лібэральнічаць з кулаком. Старшыня Гарадзецкага сельсавету—Шаршнёў і сакратар партячэйкі—Прыкалоцін ня прымаюць мер, каб спагнаць цьвёрдыя заданьні з кулакоў—Хведара Севярына, Ільі Балабоўкі, Ісака Пугача, Максіма Апанка, і Макара Каначана. Апошні нават па ракамандацыі сакратара ячэйкі быў прыняты ў калгас «Прымежны калгасьнік». Раённыя арганізацыі зусім не заўважылі кулацкіх агентаў—Шаршнёва і Прыкалоціна, якія зрываюць лёназагатоўкі.

Асабліва ўпарта сабатуюцца лёнагатоўкі па Чарапоўшчанскім сельсавеце, дзе старшыня сельсавету Даніленкаў і сакратар партячэйкі Старанькаў адкрыта ўзялі пад сваю абарону кулака. Гэтыя апартуністы зусім згубілі клясавую пільнасьць, яны ў адміністрацыйным парадку зьнімалі цьвёрдыя заданьні з кулакоў, перакладалі загатоўкі на беднату.. Пастановай бюро райкому і РКК Даніленка і Старанькаў выключаны з партыі. Абодвы яны прыцягнуты да судовай адказнасьці. 26 сьнежня выязная сэсія Вушацкага суда прыгаварыла Старанькава да 5 год пазбаўленьня волі, Даніленку—да 3 год з канфіскацыяй іх маёмасьці і высяленьнем іх за межы БССР пасьля адбыцьця пакаранньня.

(БЕЛТА)

Кулацкі камсод

КЛІМАВІЧЫ. ПУЦІМЕЛЬСКІ сельсавет ганебна адстае па лёназагатоўках. На 1 студзеня плян па здачы (продажы) лёнавалакна выкананы ўсяго на 47 проц. Асабліва адстае аднаасобны сэктар; у той час, калі калгасьнікі выканалі плян на 61,1 проц., аднаасобнікі загатовілі толькі 32 проц. заданьня. Сельсавет і партячэйка апартуністычна адносяцца да лёназагатовак. Члены сельсавету—М. Чарнамордаў, Прудзнікаў і інш. ня толькі самі ня выканалі пляну лёназагатовак, але адкрыта выступаюць у абарону кулака. Зусім невыпадкова, што цьвёрдыя заданьні выкананы ўсяго на 3,7 проц.

Камісія садзейнасьці загатовак засьмечана чужымі элемэнтамі. У камсод в. ПУЦІМЕЛЬ прадзьлі заможнікі—Хомчанка Пятро і Чарнамордаў Аніп за зрыў мясазагатовак у мінулым годзе быў прысуджаны на 8 месяцаў прымусовых работ. Кулацкі камсод вызначыў беднякам значна большыя заданьні чым заможнікам. Ня лепш справа з камісіямі садзейнасьці і па іншых вёсках сельсавету (Стайкі, Пяхар, Мядзьведзеўкі).

Гэты яўна кулацкі сабатаж лёназагатовак адбываецца на вачох у старшыні сельсавету ФРОЛАВА і сакратара партячэйкі КОТАВА, якія нічога ня робяць, каб цалкам спагнаць цьвёрдыя заданьні. У ячэйцы ёсьць такія камуністы, як АМЕЛЬЧАНКА і ГАЛАГОНАЎ, якія самі ня выканалі пляну лёназагатовак. Сельсавет і партячэйка загразьлі ў апартуністычным балоце і апынуліся на повадзе ў кулака.

РК КП(б)Б і РВК павінны неадкладна выдаліць кулацкіх абаронцаў з кіраўніцтва Пуцімельскага сельсавету і сурова пакараць іх.

С. УЛАСАЎ.

У чатыры гадзіны склад зачыняецца...

Карысаў. Апарат прыёмачнага пункту Заготлёну засьмечаны чужым элемэнтам, які рознымі сродкамі імкнецца сарваць пляны лёназагатовак. Загадчык складу Лятэцкі, як толькі прабе чатыры гадзіны, зачыняе склад. Гэтага бюракрата мала цікавіць тое, што цмат лёнапрадукцыі застаецца непрынятай. 30 сьнежня сяляне К-Слабодзкага сельсавету былі прымушаны чакаць Лятэцкага амаль цэлыя суткі. Многія лёназдатчыкі, не дачакаўшыся Лятэцкага, вярталіся дадому.

Прыёмшчык і сартыроўшчык лёнавалакна—Гільман таксама нядбайна адносіцца да сваіх абавязкаў. Гільман вельмі марудна працуе, ня цікавіцца тым, каб хутчэй адпусьціць лёназдатчыкаў, стварацца вялікая чарга, а гэта выклікае нездаволеньне калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў.

РАЙКК РСІ павінна неадкладна правесьці работу прыёмачнага пункту Заготлёну. За бюракратычныя адносіны да сваіх абавязкаў і за зрыў лёназагатовак трэба прыцягнуць да судовай адказнасьці Лятэцкага. Адначасова з гэтым неабходна арганізаваць бесперабойны прыём лёнапрадукцыі.

М. Румянка.

Там, дзе дамабілізаваліся

ГЛУСК. Вызначаныя партыяй і ўрадам тэрміны завяршэньня сельска-гаспадарчых загатовак прашлі, а раён на 1-га студзеня плян загатовак збожжа выканаў (разам з насенпазыкай) на 98,6 проц., лёнавалакна — на 68,5 і бульбы на—79,5 проц.

У гнілым лібэралізьме, бястурботных адносінах сутнасьці патрэбнай барацьбы з кулацтвам і яго агентурай у сабатажы загатовак з боку асобных членаў партыі (адказнага сакратара РВК НАЎМЕНКА, старшыні Жалвінецкага сельсавету Лашчэўскага, настаўніка Чабана і інш.)—толькі ў гэтым прычына адставаньня Глускага раёну ў загатоўках.

Некаторыя сельсаветы (Загальскі, Гарадкоўскі, Азьленскі, Парэцкі) пачалі самасупакойвацца на дасягнутых посьпехах у збожжазагатоўках, у той час, як яны па загатоўках лёнавалакна і бульбы значна адсталі. Так, плян загатовак бульбы на 1-га студзеня Загальскі сельсавет выканаў толькі на 36 проц., а Гарадкоўскі—на 46,5 проц. Па лёнавалакне. Парэцкі сельсавет плян выканаў толькі на 44,6 проц., Азьменскі—на 48,4 проц.

Занясьценьне на чорную дошку ЖАЛВІНЕЦКАГА сельсавету за невыкананьне пляну загатовак, за сабатаж (на 1 студзеня плян збожжа выканан на 75,4 проц., лёнавалакна—на 47,6 проц. і бульбы—на 69 проц.) з усімі мерамі эканамічнай узьдзейнасьці, робіць рашучае папярэджаньне ў першую чаргу АЗЕМЛЯНСКАМУ сельсавету, які плян загатовак збожжа выканаў на 89 проц., лёна валакна—на 48,4 проц. і бульбы—на 86 проц. і Гацкаму сельсавету, які выканаў плян па збожжы на 90,8 проц., лёнавалакне—59 проц. і бульбе—61,5 проц.

РК КП(б)Б і РВК адзначылі ганебнае адставаньне раду сельсаветаў у лёназагатоўках (Парэцкага, Жалвінецкага, Азьмянскага, Ляскавіцкага, Кацкаўскага, Гацкага, Загальскага, і Карпілаўскага). Адзначана, што пакаранныя сельсаветы, партячэйкі і асабліва ўпаўнаважаныя РК і РВК, якія працуюць у гэтых сельсаветах, лібэральна, апартуністычна адносяцца да барацьбы за лён, зрыва

ПАЗШ

„Горкія факты сацыяльнага становішча"

НЬЮ-ЁРК. 2-1. У 1929 годзе Гувэрне[r] заснаваў «камітэт па абследаванні сацыяльных тэндэнцый» у ПАША. Да ра[бо]ты камітэту былі прыцягнуты [...] вучоных, эканамістаў, статыстыкаў [і] г. д., пр чым [...] камітэту фі[нан]сваў Рокфэллер.

Сёньня камітэт апублікаваў даклад, [у] дакладзе гаворыцца, што камітэт [...]ня хоча заняць «бесстароннюю пазі[цыю]», але ня можа схаваць «горкія [фа]кты сацыяльнага становішча або т. [...]ваць небяспечнае далейшага руху [наш]ых цяжкай тэхнічнай машыны га[ра]ворах і масточ. якія развальваюць [...]».

Даклад падкрэсьлівае супярэчнасьці [...]скуючага ладу і неадпаведнасьць па[...] сацыяльнымі формамі і тэхнічным [...]ратрэсам, кантраст паміж раскошна [...]сталяванымі па апошнім слове тэх[...]кі небаскробам і зьдзіўляючай пры[...]тыўнасьцю трушчобаў». Даклад ад[...]значае неадпаведнасьць прадукцыі і [...]спажываньня, зьмяншэньне попыту на [...]рабочыя рукі ў выніку тэхнічнага пра[...]трэсу і г. д. Паводле слоў дакладу, ка[...]кірэнцыя разбурвае рэсурсы краіны, [...] сельская гаспадарка нідзе, лішні ўра[...]джаю не знаходзяць збыту.

«Калі па будучэ тэрміновая зьмене[...]ны сацыяльныя ўмовы,—гаворыцца да[...]лей ў дакладзе,—або калі не затармо[...]зіць тэмп тэхнічных вынаходніцтваў, [...]дык гэта прывядзе да рэзкай дыспра[...]порцыі».

Аўтары дакладу падкрэсьліваюць, [...]што перамога сучаснага крызісу ме[...]ва-б сваім вынікам толькі наступленьн[...]ем эндэкаў «ГАЗЭТА ВАРШАЎСКА» заяўляе: «Германія можа паставіць пытаньне рэвізіі межаў толькі шляхам узброенага нападу на польскую тэрыторыю. Вайна паміж Германіяй і Польшчай — дзеяначе газэта — няўхільна ператварылася-б у сусьветную вайну».

Урадавы орган «КУР'ЕР ПАРАНІЫ» гаворыць: «Колы блізкія да канцлера Шлейхэра ўпэўніваюць сябе, што сама дыскусія па пераглядзе мо[...]жаў азначае пагрозу вайны. Няма і ня будзе такога ўраду, які даў-бы сваю згоду на такую дыскусію».

Кампанія польскага і германскага друку сьведчыць аб далейшым абвастрэньні польска - германскіх адносін. Польскі пасол у Бэрліне атрымаў ды рэктыву заявіць пратэст германскаму ўраду з прычыны антыпольскай прапаганды радыёстанцыі ў Кенігсбэргу.

Германія

2065 самагубстваў у Бэрліне

БЭРЛІН 1-1. Падагульваючы вынікі 1932 году «РОТЭ ФАНЭ» зазначае, што ад сьцяжня да лістапада 1932 г. у адным толькі Бэрліне НА ГЛЕБЕ ГОЛАДУ І ГАЛЕЧЫ ПАКОНЧЫЛІ САМАГУБСТВАМ 2065 ЧАЛ. Да гэтага на[...]ліку дадаць яшчэ значна больш колькасьць замахаў на сама[...]губства.

Па ступені галечы працоўных Берліну можна судзіць нават па тым, што колькасьць беспрацоўных, пазбаўленых дзяржаўных дапамог па беспрацоўі, узрасла да канца лістапада 1932 г. да 330845 чал. супроць 221209 чал. у пачатку 1932 г. Апрача таго, па водле даных «Ротэ Фанэ» 88.310 бэрлінскіх беспрацоўных не атрымліваюць ніякай дапамогі, нават жаорадкіх падачак з дабрачынных кас. У выніку крызісу і узросту беспрацоўя, насельніцтва Бэрліну хутка зьмяншаецца. З 1 студзеня па 1-га сьнежня 1932 г. колькасьць жыхароў зьменшылася з 4.288.211 чал. да 4.229.512 чал. Асабліва трэба падкрэсьліць, што ў 1932 годзе сьмяротнасьць пера вышала раджальнасьць амаль на 25 проц.

Фашысты страляюць у рабочых

БЭРЛІН. 2-1. У новагоднюю ноч у розных раёнах Бэрліну зноў мелі мес ца тэрарыстычныя акты нацыянал-сацыялістаў, накіраваныя супроць рэвалюцыйных рабочых. У раёне Ліхтэнрадэ нацыянал - сацыялістамі зьбіты камуніст - рабочы Герман. Два другіх рабочых цяжка паранены. Сьмяротна паранены малады сацыял - дэмакратычны рабочы, які праз некалькі гадзін памёр.

Нацыянал - сацыяліст, які ехаў на самакаце па Адлерштрасе, адкрыў агонь з рэвальвэра па групе рабочых, якія стаялі на вуліцы. Адным са стрэлаў забіта жаночка. У Эранзе (ля Трыра) нацыянал - сацыялісцкія штурмавікі цяжка паранілі 3-х рабочых—камуністаў. У Вупэртале нацыянал - сацыялісты цяжка паранілі аднаго рабочага.

БЭРЛІН. 2-1. На 1-га студзеня ў Бэрліне зарэгістравана 15 выпадкаў замахаў на самагубства. Апрача таго некалькі чалавек утапілася і два атруціліся.

Англія

Новае звальненьне 30.000 рабочых

ЛЁНДАН. 2-1. «МАНЧЭСТЭР ГАРДЫ�ЯН» паведамляе, што ў бліжэйшыя дні па ўсёй Англіі будзе звольнена самае мен[...]ае 30.000 сельска - гаспадарчых рабочых.

Дэманстрацыя беспрацоўных у Глазго

ЛОНДОН. 2-1. У Глазго адбылася шматлюдная дэманстрацыя беспрацоўных, якія пратэставалі супроць раўзьняньня гарадзкога муніцыпалітэту ад мовіцца ад павялічэньня дапамог на зімовы час. Мясцовыя ўлады мабілізавалі 2.000 паліцэйскіх «для папярэджаньня непаразкаў».

Польшча

Абвастрэньне польска-германскіх адносін

ВАРШАВА. (ТАСС). Польскі буржуазны друк поўны артыкулаў, накіраваных супроць Германіі. Прычынай для ўзмацненьня антыгерманскай прапаганды зьявілася паведамленьне бэрлінскага карэспандэнта «Таг» аб закулісных германскіх плянах наконт перагляду межаў, а таксама і артыкул у германскім друку аб праблеме Данцынгскага калідору і антыпольскай прапагандзе радыёстанцыі ў Кенігсбэргу.

Эндэцкі «КУР'ЕР ПАЗНАНСКІ» піша: «ГЕРМАНІЯ МЯРКУЕ Ў 1933 ГОДЗЕ ПАСТАВІЦЬ ПЫТАНЬНЕ АБ ПЕРАГЛЯДЗЕ МЕЖАЎ. Сьвет павінен ведаць, што той, хто гаворыць аб пераглядзе межаў рыхтуе вайну. Польшча павінна быць напагатове даць адпор новаму дыпляматычнаму наступленьню Германіі». Галоўны ру-

Францыя

За адзіны фронт докераў

ПАРЫЖ. 2-1. Адбылася скліканая па ініцыятыве докераў у Дзюнкірхене канфэрэнцыя докераў Францыі. На канфэрэнцыі прымалі ўдзел 22 дэлегаты докераў розных вартоў, пераважна члены ўнітарных (рэвалюцыйных) прафсаюзных арганізацый. Былі прадстаўнікі найбольш важных партоў Францыі як-та: МАРСЭЛЯ, НАНСА, КАЛЭ, ГАЎРА, ДЗЮНКІРХЭНА, БУЛОНІ і г. д. Апрача таго ў канфэрэнцыі прынялі ўдзел кіраўнікі ўнітарнай фэдэрацыі партовых рабочых і ўнітарнай фэдэрацыі маракоў і рыбакоў і дэлегаты рабочых бэльгійскага порта ГЕНТ.

Канфэрэнцыя рашуча выказалася супроць усякіх тарыфных з[...] ставяць зарплату ў залежнасьць ад афіцыйных даных індэксаў кошту жыцьця.

Канфэрэнцыя прыняла аднагалосна адозву, якая намячае задачу ў справе утварэньня адзінага фронту докераў для барацьбы за іх штодзённыя патрабаваньні.

У бязьлітаснай барацьбе з кулаком і яго агентурай дабіцца датэрміновага выкананьня мясазагатовак I кв. 1933 г.

Загадчыка Клімавіцкага райпункту заготжывёлы прыцягнуць да адказнасьці

КЛІМАВІЦКІ раён да апошняга часу быў адным з самых адстаючых у выкананьні пляну мясазагатовак IV кварталу. Галоўная прычына ганебнага адставаньня раёну — самацёк у мясазагатоўках, вакол іх ня была мабілізавана ўвага грамадзкасьці.

Дырэктывы партыі і ўраду аб загатоўках, у выніку бязьдзейнасьці райканторы Белзагатжывёлы, не даходзілі да шырокіх мас працоўных аднаасобнікаў і калгасьнікаў. Барацьба з кулацкім сабатажам амаль не вялася.

І толькі пасьля пленуму ЦК КП(б)Б, калі былі мабілізаваны масы працоўных аднаасобнікаў і калгасьнікаў на выкананьне мясазагатовак, наступіў пералом у выкананьні пляну. Так, на 24 сьнежня было выканана 60,7 проц квартальнага пляну, на 25—64 проц., на—27—65 проц. Як мы бачым з паданых лічбаў, кожны дзень даваў прырост у выкананьні пляну мясазагатовак па 4—5 проц., а у апошнія дні нават па 7—8 проц.

Побач з гэтым патрэбна адзначыць рад агідных зьвішчаў, якія наглядаюцца ў практыцы работы райканторы Белзагатжывёлы. Так, ля пункту ёмачнага пункту, з-за дрэннай работы прыёмшчыка, зьбіраецца вялікая чарга здатчыкаў, шмат хто не пасьпявае здаць мяса, і вяртаюцца дамоў.

Наогул патрэбна адзначыць, што загадчык пункту ПРУДНІКАЎ і прыёмшчык РЫЎКІН не адчуваюць ніякай адказнасьці за сваю работу. Толькі злачыннымі адносінамі да выкананьня пляну мясазагатовак магчма тлумачыць той факт, што на двары прыёмачнага пункту валяецца здохлыя куры, што шмат кур ляжаць у пуні неразьвязанымі, што на станцыі Клімавічы тры дні прастаялі каровы і іншая жывёла некормленымі у чаканьні адпраўкі на пункты прызначэньня.

«Герой» гэтых фактаў—ПРУДНІКАЎ хоча тлумачыць такія ганебныя факты тым, што здохлыя куры былі прывезены Раднянскім ССТ, што куры неразьвязанымі дастаўлены здатчыкамі а ТРУДНІКАЎ і прыёмшчык РЫЎКІН як быццам пры прыемцы ўсяго гэтага ня бачылі.

Па пасобных сельсаветах раёну ёсьць факты, калі кулацкія элементы з партоілетам у кішэні яўна сабатуюць мясазагатоўкі. У СТУДЗЯНЕЦКІМ сельсавеце згодна апошніх вестак плян выкананы усяго толькі на 16,96 проц., а члены партыі—АЎРАМЕНКА, ПУГАЧОЎ і іншыя ня толькі ня праводзяць работу сярод працоўных аднаасобнікаў і калгасьнікаў па здачы (прадажы) мяса, але нават і самі не здалі яшчэ ніводнага кілёграму. Апартуніст АСМАЛОЎСКІ заяўляе, што загатоўкі трэба выконваць «па меры магчымасьці».

КЛІМАВІЦКІ райпункт Белзагатжывёлы павінен быць ачышчаны ад пралезшых у яго апарат клясава-варожых элемэнтаў і умацаваны лепшымі работнікамі.

Зрыўшчыкі мясазагатовак АЎРАМЕНКА, ПУГАЧОЎ, АСМАЛОЎСКІ і інш. павінны быць прыцягнуты да партыйнай адказнасьці.

І толькі пры гэтай умове, пры мове яшчэ большага разгортваньня барацьбы за выкананьне мясазагатовак, рашучай і непрымірымай барацьбы з кулаком і яго агентурай раён справіцца з выкананьнем бальшавіцкай праграмы мясазагатовак 1 кварталу 1933 году.

К.

Апартуніста Скобава вывесьці са складу сельсавету

МІШКАЎСКІ сельсавет (Сіроцінскі раён) увесь час ганебна правальвае важнейшыя гаспадарча-палітычныя кампаніі. Правальваецца і выкананьне пляну мясазагатовак. Пасобныя калгасы, як імя Дзяржынскага, які павінен быў ў IV квартале здаць (прадаць) дзяржаве 93 кілё мяса, згодна вестак на 27 сьнежня, ня здаў яшчэ ніводнага кілёграма. У старшыні гэтага калгасу ёсьць няўпэўненасьць «ці патрэбна здаваць мяса дзяржаве». Ня лепшае становішча з выкананьнем мясазагатовак і ў іншых калгасах гэтага сельсавету.

Дрэнна абстаіць справа з выкананьнем пляну калгаснымі дварам. Пасобныя цьвёрдазаданьнікі, як Шэдзка Станіслаў і інш., яўна сабатуюць мяса загатоўкі; ніякіх мер узьдзейнічаньня сельсаветам да іх ня прымаецца. Усё гэта адбываецца ў той час, калі раён яшчэ на 23 сьнежня выканаў плян мясазагатовак на 101.5 проц.

Дзеж прычыны ганебнага адставаньня сельсавету?

Мішкаўскі сельсавет засьмечаны клясава-варожым элемэнтам. Сакрэтар МІШКАЎСКАГА сельсавету—СКОБАЎ пітурае сабатажнікам загатовак. На працягу ўсяго часу загатоўчай кампаніі Скобаў па цьвёрдых заданьнях не стагнаў ніводнага кілёграму мяса, бо кулак яго сваякі. Ён, бачыце іх не жадае «такрыўдзіць».

Скобаў увесь час абараняў свайго сына—цьвёрдазаданьніка, які ня выканаў свайго заданьня. На прымацаваны пункт Скобаў ніколі ня прыходзіць і не вядзе ніякай работы ў напрамку загатовак.

Слыніць бязьдзейнасьць. МІШКАЎСКІ сельсавет павінен быць ачышчаны ад клясава-варожых элемэнтаў. На пасьпяховае выкананьне мясазагатовак пазнані быць мабілізавана ўвага шырокіх працоўных мас. МІШКАЎСКІ сельсавет мае ўсе магчымасьці для выкананьня ў тэрмін мясазагатовак. Планы загатовак рэальны, аб гэтым даказ[...]ны загатовак сельсаветы Сіроцінскага раёну. Пасьпяхова выканаўшы плян мясазагатовак.

Упушчанае ў IV квартале павінна быць пакрыта перавыкананьнем пляну мясазагатовак у 1 квартале 1933 году.

Д. Ш

Халадзільная гаспадарка БССР у другой пяцігодцы

Харчовая прамысловасьць павінна ня толькі вытварыць неабходную колькасьць прадуктаў, але галоўным чынам захаваць і даставіць гэтыя прадукты спажыўцу ў добраякасным стане. А гэтага можна дасягнуць толькі шырокай арганізацыяй халадзільных гаспадарак.

На тэрыторыі БССР у сучасны момант ёсьць халадзільнік пры мясакомбінаце ў Гомелі пры мясакамбінаце ў Воршы пры мясакамбінаце ў Жлобіне Заканчваецца будаўніцтва халадзільніку ў Віцебску Апрача таго, ёсьць халадзільныя ўстаноўкі пры браварным заводзе «Беларусь» у Менску і пры малочных заводах Менску і Віцебску. Будуемая ў Менску ф-ка-кухня таксама будзе мець сваю халадзільную ўстаноўку для хаваньня запасу прадуктаў на 10 дней.

Усе пералічаныя халадзільнікі разлічаны для забясьпечаньня толькі вытворчых патрэб гэтых прадпрыемстваў.

Для хаваньня-ж прадуктаў, якія хутка псуюцца, бягучых патрэб і рэзэрваў халадзільнай плошчы ў сучасны момант няма.

Паводле пляну 2-й пяцігодкі намечана арганізаваць базісна-разьмяркавальныя халадзільнікі ў буйных гарадох (Менску, Гомелі, Віцебску і Бабруйску).

Асобна намечаны халадзільнікі пры мясных камбінатах для задавальненьня патрэб вытворчасьці, халадзільнікі пры яйка-птушкавых камбінатах так сама для патрэб вытворчасьці і прыёмча-загатоўчыя халадзільнікі для абслугоўваньня патрэб загатоўцаў прадуктаў, якія хутка псуюцца. У тых населеных пунктах, дзе ня будзе бэзіснараньмяркавальных халадзільнікаў, хаваньне прадуктаў бягучых патрэб і рэзэрваў будзе адбывацца па халадзільніках мясакамбінатаў. Гомельскі халадзільнік павінен будзе абслугоўваць і патрэбы ў халадзільнай плошчы маргарынавага заводу.

Апроч таго, для задавальненьня насельніцтва натуральным лёдам у буйных прамысловых цэнтрах будуць пабудаваны леднікі, а для абслугоўваньня халадзільнікаў аўтатранспартам, для развозкі прадуктаў, патрэб на будзе прыкладна 40 грузавых аўтамашын, грузапад'ёмнасьцю па 1,5 тоны кожная.

Такім чынам, у канцы 2-й пяцігодкі на тэрыторыі БССР мы будзем забясьпечаны неабходнаю халадзільнаю плошчаю, якая дасьць магчымасьць захоўваць прадукты, якія хутка псуюцца ў сярэднім па 11-12 кгр. на душу гарадзкога і прыгараднога у радыюсе 10 клм., насельніцтва. Назалежна ад гэтага на ледніках будзе загатаўляцца штогод натуральнага лёду з разьліку па 44 кгр. на аднаго гарадзкога жыхара.

Значыцца, праблема арганізацыі нармальнага забясьпечаньня насельніцтва харчовымі прадуктамі на працягу ўсяго году, а галоўным чынам, у летні час будзе вырашана цалкам шляхам арганізацыі халадзільнай гаспадаркі, заснаванай на новейшых дасягненнях навукі і тэхнікі.

Баравік

Пра ход лесазагатовак і лесавывазкі

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Заслухаўшы інфармацыю упаўнаважанага НК Лясной прамысловасьці тав. РОЗІНА аб ходзе лесазагатовак і лесавывазкі ў IV квартале 1932 г., Савет Народных Камісараў БССР прызнае зусім ганебнай работу наступных леспрамгасаў:

	Выкананьне квартальн. га пляну па вывазцы.	
	Будаўн. драўніны	Дроў.
Будакавалеўскі	11,0	5,7
Бешанковіцкі	6,5	9,8
Глускі	5,8	10,9
Вушацкі	13,4	11,0
Нараўлянскі	18,5	18,0
Сіроцінскі	1,8	8,7
Слуцкі	3,7	10,0
Крупскі	16,8	2,5
Клічаўскі	11,0	13,2
Асіпавіцкі	16,8	12,1
Бабруйскі	17,7	27,0
Любанскі	27,3	5
Парынкі	11,96	16,2

Савет Народных Камісараў БССР адзначае, што такая ганебная работа гэтых леспрамгасаў зьяўляецца вынікам наяўнасьці зэсьмечанасьці апарату леспрамгасаў клясава-чужым элемэнтам, адсутнасьці з боку кіраўнікоў леспрамгасаў нацыску і клясавай пільнасьці да кулацкага сабатажу лесазагатовак і таго, што замест штодзённага апэрацыйнага кіраваньня работай у гэтых леспрамгасах панує самацёк і спадзяваньне на добры санны шлях.

Савет Народных Камісараў БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. За зрыў квартальнага заданьня па лесазагатоўках і лесавывазцы зьняць з работы і аддаць пад суд дырэктароў наступных леспрамгасаў: Будакавалеўскага—т. Раманенка, Бешанковіцкага—т. Вікмана, Глускага—т. Казакова.

2. Абвясьціць суровую вымову і зьняць з работы дырэктароў наступных леспрамгасаў: Вушацкага—т. Ушакова, Сіроцінскага—т. Навакоўскага, Слуцкага—т. Дашкова.

3. Абвясьціць суровую вымову з пазіраваньнем дырэктарам наступных леспрамгасаў: Крупскага—т. Кагану, Клічаўскага—тав. Альпэрыну, Асіпавіцкага — тав. АСТРАХАНУ, Бабруйскага — тав. ЛЕВІНУ, Любанскага—т. Шмыга, Парыцкага—т. Ляўчонку і Нараўлянскага—т. Навіцкаму.

4. Даручыць кіраўніку Лесбелу тав. Шапіра ў аднадзенны тэрмін прыцягнуць да адказнасьці намесьнікаў дырэктароў і іншых работнікаў паказаных вышэй леспрамгасаў.

5. Папярэдзіць усіх дырэктароў астатніх адстаючых па лесазагатоўках і лесавывазцы леспрамгасаў, што калі на працягу бліжэйшых дзён мі ня будзе зроблена пералому ў рабоце, Савет Народных Камісараў БССР будуць ўжыты да іх меры суровага спагнаньня.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Кіраўнік справаў СНК і ЭКАНА БССР С. КАНДЫБОВІЧ.

2 студзеня 1933 г.
г. Менск.

З ФРОНТУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

Посьпехі Бярэзінскага камбінату

У параўнаньні з мінулым годам, у 1932 годзе па запалкавай фабрыцы Бярэзінскага камбінату выпуск прадукцыі ўзрос на 18 проц., прадукцыйнасьць працы ўзрасла на 25 проц., сярэдняя зарплата—на 34,68 проц., склад рабочых павялічыўся па 11 проц.

Па фанэрным заводзе камбінату выпуск прадукцыі ўзрос на 25 проц., прадукцыйнасьць працы—на 16 проц., зарплата—на 22 проц, склад рабочых—на 43 проц. Прадукцыя ЦС камбінату ўзрасла на 32 проц, прадукцыйнасьць працы — на 20 проц., зарплата — на 27 проц.

На працягу 1932 году праведзена капітальнае будаўніцтва і рамонт фанэрнага заводу. Пабудавана вялікае памяшканьне для ФЗУ і тэхнікуму.

За гэты-ж год павялічыўся выпуск экспортнай прадукцыі на 250 проц. у параўнаньні з 1931 годам.

Колькасьць гаспадарча-разьліковых брыгад па камбінаце павялічылася да 26 са 1040 ударнікамі.

⊙ МЕНСК. Прэзыдыум БАН у свой тэматычны плян уключыў пытаньне аб вывучэньні Клімавіцкага Буджылкамбінату. Індустрыяльны буджылкам бінат будзе вырабляць дэталі і канструкцыі для зборных каркасна-буйна блёчных грунтоўных, шматпавярховых жыльлёвых будынкаў з пасьлядоўным мантажам іх на будпляцоўках. Да 75 проц усіх неабходных будматар'ялаў камбінат павінен выпрацоўваць уласнымі сродкамі на базе мясцовых сыравінных рэсурсаў (рухдзяковая вапна, кварцавыя пяскі, гліна трэпел, лес торф).

Вытворчасьць камбінату праэктуецца ў 2.500.000 кб. м. гатовых жыльлёвых будынкаў у год. Каштоўнасьць намечаных плянам работ арыентыровачна выражаецца ў 2.847.300 руб, з якіх у першую чаргу на 1933 год патрэбна будзе 1.426.200 руб. і ў другую чаргу гэтага - ж году — 912.100 руб., для заканчэньня работы ў 1934 годзе астатняя сума. Агульны нагляд і кіраўніцтва работамі даручана Інстытуту эканомікі БАН.

⊙ ГОМЕЛЬ. На працягу 1933-34 гг. будзе пабудаваны гідрагенізацыйны завод. Кошт пабудовы 3,5 млн. руб. Завод будзе вырабляць на 13 млн. руб. прадукцыі ў год.

⊙ ГОМЕЛЬ. Інжынэр заводу «Пралетары» т. Балашоў вынайшоў машыну для здабываньня сухога торфу круглы год. Наркамцяжпрому БССР перасланы лічбы, якія паказваюць эфэкт гэтай вынаходкі.

⊙ Віцебск. — Да дня ўдарніка рабочыя шчотачнага камбінату ўзялі на сябе абавязак арганізаваць 10 гаспадарча - разьліковых брыгад, зьнішчыць прагулы. Разгорнутае сацпабор ніцтва паміж цэхамі і брыгадамі ўзьняла прадукцыйнасьць працы. Раней Парынскае аддзяленьне выпрацоўвала ў дзень 117 кілё шчаціны, а зараз 140. Мокра - салёнае аддзяленьне выпрацоўвала раней 170 кілё, зараз 250. Наборна - апрацоўчы цэх раней быў адстаючым, зараз гэты цэх узяў пярэшынства. Прагулы ў цэху ліквідаваны. Арганізаваны 2 гаспадарча - разьліковыя брыгады і адна ўдарная брыгада; арганізаваны ячэйкі Аўтадору і Асоавіахіму. Плян 2-й пяцігодкі даведзены да кожнага рабочага. 70 проц рабочых замацаваліся за прадпрыемствам да канца другой пяцігодкі.

Першы ўдарнік камбінату — цэхком Богры зьяўляецца кіраўнік м гаспадарча - разьліковай брыгады. Разьліковая брыгада Патапэнкі пабіла рэкорд, выкананаючы дзённае заданьне да 150 проц.

Аб дзяржаўных водпусках на 1933

Пастанова Прэзыдыуму ЦСПСБ

1. Абавязаць ФЗМК забясьпечыць прадстаўленьне адміністрацыяй прадпрыемстваў і ўстаноў не пазьней 10 студзеня плану разьмяркаваньня водпускаў на 1933 г. Пры складаньні пляну поўнасьцю кіравацца дырэктывамі НКП СССР (газ. «Труд» № 300 ад 28 сьнежня). Плян павінен быць зацьверджаны ў РКК не пазьней 20 студзеня.

2. Па зацьверджаньні пляну ў РКК адміністрацыя абавязана вывесіць яго на працягу пяці дзён (не пазьней 25 студзеня у цахох, кватэрах, прадпрыемствах у ўсіх аддзелах установ.

3. НКПрацы БССР даць паказаньні органам працы праводзіць перыядычна на праверку выкананьня пастановы НКП СССР аб водпусках, прыцягваючы да праверкі прамадзкіх інспэктораў.

4. ЦП саюзаў і гаррайпрафсаветам просачыць за своячасовай рэалізацыяй гэтае пастановы.

Пра дапаўненьне арт. 6 пастановы ЦВК і СНК БССР пра працоўны ўдзел насельніцтва ў дарожным будаўніцтве

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць: дапоўніць арт. 6 сваёй пастановы за 21 ліпня 1932 г.—«Пра працоўны ўдзел насельніцтва ў дарожным будаўніцтве» (З. З. БССР 1932 г. № 39, пост. 171) п. «а» наступным зьместу:

«а») [illegible] леспрамгасам на час дзейнасьці [illegible] дагавору з леспрамгасам.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Нам. старшыні Савету Народных Камісараў БССР К. БЭНЭК.

Вык. аб. Сакрэтара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР М. [illegible]

Па Саюзе ССР

Перамогі першай пяцігодкі

Перад нафтапрамысловасьцю адкрываюцца шырокія пэрспэктывы

Нафтапрамысловасьць Саюзу, якая апрача народна - гаспадарчага, мае яшчэ і вялізарнае палітычнае значэньне, як буйнейшая частка нашага экспарту, мае права ганарыцца сваімі перамогамі за гады першай пяцігодкі. Першая з усіх галін прамысловасьці Саюзу — нафтавая, датэрмінова, у 2 з палов[illegible] гады, выканала свой пяцігадовы [illegible]н. У сакавіку 1931 году, дасягнуўшы сярэднясутачнай здабычы ў 58.400 тон нафты, нафтапрамысловасьць перавысіла ўзровень, вызначаны пяцігодкай на 1932-33 год (54 5.0 тон). У мінулым годзе СССР па ўзроўні нафтаздабычы выйшаў ужо на другое месца ў сьвеце, уступаючы толькі ПАЗШ. Даваенны ўзровень перавышаны амаль у тры разы.

У варожых СССР буржуазных газэтах адзін час зазначалася на тое, што нафтапрамысловасьць СССР жыве «спадчынай мінулага». Гэты паклёп лёгка абвяргаецца данымі аб суадносінах паміж шчылінамі, якія былі да рэвалюцыі і шчылінамі, пушчанымі пры савецкай уладзе. У 1920-21 годзе здабыча з нацыяналізаваных шчылін склала 3 млн. тон нафты, а ў 1931 годзе ўжо ўпала да 1,1 млн. тон. Наадварот, здабыча з новых шчылін выросла з 0,6 млн. тон у 1920-21 г. да 1,2 млн. тон у 1931 г.

Ніводная галіна прамысловасьці ня мела так шырока рэканструявана і нацыяналізавана, як нафтавая. У даваенны час тартаньне (жэлонка) было асноўным мэтадам нафтаздабычы. Пры савецкай уладзе, у выніку шырокай рэканструкцыі тартаньне амаль цалкам заменена ўдасканаленымі мэтадамі здабычы — глыбокімі помпамі і кампрэсарамі. Да нацыяналізацыі ў нафтапрамысловасьці амаль цалкам панавала канатнае і штангавае сьвідраваньне. Пры савецкай уладзе пачалі ўжываць вярчальнае сьвідраваньне, на долю якога ўжо ў 1931 годзе прыпала 89 проц. усіх сьвідравальных работ. З 1924-25 гг. у практыку ўведзены яшчэ больш удасканаленыя спосаб сьвідраваньня — турбіны (турбабур) — вынаходка савецкага інжынэра Капялюжнікава. Хуткасьць сьвідраваньня, дзякуючы рэканструкцыі і рацыяналізацыі, вырасла з 50 мтр. на штанка-месяц даваеннага часу да 112 мтр. у 1931 годзе (у эксплёатацыйным сьвідраваньні).

Пасьпяховае разгортваньне сьвідравальных работ дало за гады першай пяцігодкі рад буйных новых месцанараджэньняў. Выяўлены вялізарныя рэсурсы, якія ставяць Саюз на першае месца ў сьвеце па запасах нафты. Гэтыя запасы вызначаюцца ўжо прыблізна ў 2 млрд. тон. Буйнейшых посьпехаў дамагалася нафтапрамысловасьць у пераапрацоўцы. Да пачатку пяцігодкі ў асноўным нафтавым рэчне пераапрацоўвалася толькі 65 проц ўсёй здабытай нафты. У мінулым-жа годзе ўся здабытая нафта і лягкая і цяжкая пайшла ў пераапрацоўку. Асвоены найбольш удасканаленыя мэтады пераапрацоўкі — крупчаткі, каланкі, крэкінгі ды інш. Магутнасьць нашых заводаў па кірпічнай гонцы нафты дасягнута ўжо ў мінулым годзе 23 млн. тон, а крэкінгаў—3.200.000 тон.

Варта адзначыць, што да пачатку пяцігодкі ў нас ня было яшчэ ніводнай крэкінг - ўстаноўкі, зараз іх ужо 27.

Савецкім машынабудаўніцтвам амаль цалкам асвоены выраб нафта - перагонный апаратуры. І тут мы ў значнай ступені вызваліліся ўжо ад імпартнай залежнасьці. Рэзка вырасла энэргаўзброенасьць нашых промыслаў. Па электрыфікацыі промыслаў мы далёка пакінулі зваду ПАЗШ. У другім пяцігодзьдзі перад нашай нафтапрамысловасьцю адкрываюцца шырокія пэрспэктывы.

Хроніка

▲ 27 ПАЛІТЭХНІЧНЫХ МУЗЭЯЎ [...] фабрыках, саўгасах і калгасах [...]анізуецца ў БССР у 1933 г.

▲ 21 ТЫС. РУБ. сабраў Менгарсаюзу ваяўнічых бязбожнікаў на [...]удову падводнай лодкі «Ваяўнічы [...]божнік».

▲ 7—8 студзеня у Менску адбудуцца канцэрты вядомай сьпявачкі народных сьпеваў А. ЗАГОРСКАЙ. У [...]цэртах прыме удзел прафэс[illegible] Маскай кансэрваторыі БАРЫСАЎ.

▲ [illegible] запрашэньні Белдзяржэту ў люты месяцы у БССР прыяжджае на ролі заслужаны артыст рэспублікі прафэсар Маскоўскай кансэрваторыі М. ЭРДЭНКА.

▲ ЯЧЭЙКА МОПР ФАБРЫКІ «ПРАГЭРТ» — за прыкладную масавую [...]ну па выкананьні задач па зімо[...] дапамозе палітвязьням пэм'яв[...] Віцебскім гаркомам МОПРу.

▲ УСЕСАЮЗНАЯ НАРАДА ТАВАРСТВА ВЫНАХОДНІКАЎ па разваньні вынаходніцтва ў галіне [...]скай гаспадаркі склікаецца 15-га [...]зеня ў Маскве. За ўзорную рабо[...] а арганізацыі ячэек у галіне сель[...] гаспадаркі ЦС таварыства вына[...]каў БССР прадстаўляе па дзі[...]у месцы на гэтую нараду ГО[...]

▲ АГЛЯД УЗОРНЫХ ШКОЛ БССР з мэтай вывучэньня і перанясеньня вопыту на іншыя школы рашэньнем калегіі НКА і прэзыдыуму ЦП саюзу працаўдзеты будзе праведзены на працягу лютага і сакавіка 1933 году.

▲ СЭКЦЫЯ БАРАЦЬБЫ МГСФК зрабіла выхад Смаленску, Харкаву, Гомелю і Бабруйску на сустрэчу па барацьбе ва ўсіх вагавых катэгорыях у другой палове студзеня.

▲ III пленум саюзу працмастацтва адбудзецца ў студзені 1933 году ў Віцебску. Пленум заслухае даклад кіраўніка Белдзяржкіно тав. ГАЛКІНА аб кінофікацыі БССР у другой пяцігодцы.

▲ Адзіны савецкі дзень у калгасах і саўгасах рэчну па падрыхтоўцы дасеннавой сяўбы рашэньнем бюро Віцебскага гаркому партыі і прэзыдыуму гарсавету будзе праведзены ў другой палове студзеня.

▲ Менская абутковая фабрыка значна пашырае сваю работу. У 1933 годзе намечана пабудова новага штамповачнага цэху, а таксама будзе скончана рэканструкцыя старых цэхаў.

КІНО ПАЛЕТ ЦЫЯНА! Каса ад 2 г. дня

Ад 31 сьнежня маст. фільм ПАРТФЭЛЬ ДЫПКУР'ЕРА лш праграмы кіно-хроніка Саюзкіно

Трэст грамадзкага харчаваньня г. Менску гэтым паведамляе, што з 1-га студзеня 1933 г. ЛІКВІДУЕЦЦА

Усе прэтэнзіі ад арганізацый і асоб будуць прымацца да 15 студзеня 1933 г.

Пасьля паказанага тэрміну, ніякія прэтэнзіі разглядвацца ня будуць

Трэст грам. харчаваньня

БЕЛАРУСКАЕ аддзяленьне „САЮЗЗАКУПГАНДЛЮ" з 29 сьнежня 1932 г. ЛІКВІДУЕЦЦА

Усе прэтэнзіі ад арганізацый і асоб будуць прымацца да 10 I 1933 г.

Пасьля паказанага тэрміну прэтэнзіі разглядацца ня будуць

Ліквідком

РАЁННАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ ПА ЎЗДЫМЕ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ ПЕРАНОСІЦЦА на 13-га студзеня 1933 г.

На канферэнцыю павінны зьявіцца аграномы калгасных сыстэмы саўгасаў і інш. сельска-гаспадарчых арганізацый, сакратары сельпартячэек, старшыні сельсаветаў, дырэктары і інш. дырэктароў саўгасаў, старшыні і брыгадзіры калгасаў, а таксама запрашаюцца рэйтаграмы раёнаў у межах б. Менскай акругі.

Пачатак а 10-й гадзіне раніцы ў залі паседжаньняў Менгарсавету

Згубленае пасьведчаньне аб надзоманым плацежы за №№ 02719 і 102711, лічыць несапраўдным Белзагатлёт

Згубленую чыгуначную накладную за № 86896 Менск-Уручча, выд. МБК чыг., лічыць страчанай моц. Белпушніна

Згодна пастановы прэзыдыуму МКС ад 27-XI 32 г. МЫЛА-ЗАВОД „Чырвоны Хімік" АБ'ЯДНАЕЦЦА з мылаварна-фасовачным камбінатам БКС

Прадпрыемствы і ўстановы, якія маюць прэтэнзіі, павінны пр д'явіць да 15 студзеня 1933 г.

Пасьля пакаванага тэрміну ніякія прэтэнзіі ПРЫМАЦЦА НЯ БУДУЦЬ

Дырэкцыя мылаварна фасовачнага камбінату

Матрычны выпіс, выд. Менскім ЗАГСам на імя Сакольнік А. [illegible]

Матрычны выпіс, выд. Бабруйскім ЗАГСам на імя Курсанаў Т. Г., кв. 795.

Ваенковы білет, выд. Бярэзанскім ваенкаматам на імя Круглік Г. Д. к